УДК 008(476):001.891"19"

# ПЕРШЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ (20–30-я гг. XX ст.)

***В. М. Белакурскі,*** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;*

***Ж. Я. Белакурская,*** *кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле аналізуецца разгортванне першых навуковых даследаванняў гісторыі айчыннай культуры вучонымі Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Высвятляецца, што гэты працэс быў звязаны з практычным рашэннем актуальных задач нацыянальнай палітыкі, накіраванай на ўсебаковае развіццё беларускай культуры ў новых умовах. Вучонымі ўпершыню былі распрацаваны падыходы да раскрыцця тэндэнцый і заканамернасцей духоўнага жыцця беларускага народа (У. І. Пічэта), стварэння беларускай дзяржаўнасці (М. В. Доўнар-Запольскі), развіцця беларускага мастацтва (М. М. Шчакаціхін), філасофскага вальнадумства (М. А. Янчук) і інш. Сярод першых грунтоўных прац разгледжаны кніга Я. Ф. Карскага «Беларусы» (1921) і артыкулы зборніка «Чатырохсотлецце беларускага друку» (1926), у якіх выразна адлюстраваны тэарэтычныя набыткі вучоных адносна сістэмнага рашэння шэрагу пытанняў, звязаных з гісторыяй беларускага народа, яго мовы і культуры. У артыкуле раскрываецца багацце і разнастайнасць тэматыкі, а таксама плённасць ідэй першых беларускіх даследчыкаў.

**Ключавыя словы:** беларускі народ, духоўнае жыццё, гісторыя, беларуская культура, навука, навуковая думка, першыя даследаванні, беларуская дзяржаўнасць, мова, мастацтва, навуковыя набыткі.

# THE FIRST STUDIES OF THE HISTORY OF BELARUSIAN CULTURE IN BELARUS (20–30s OF THE 20TH CENTURY)

***V. Belakurski,*** *PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department Social Disciplines of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»;*

***Z. Belakurskaya,*** *PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communications and Advertising of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article analyzes the deployment of the first scientific studies of the history of national culture by scientists of Belarus in the 20–30s of the 20th century. The idea is consistently carried out that this process was closely connected with the

practical implementation of the urgent tasks of the national policy aimed at the comprehensive development of Belarusian culture in the new conditions. For the first time, scientists have developed approaches to the disclosure of trends and patterns of the spiritual life of the Belarusian people (V. I. Picheta), the creation of Belarusian statehood (M. V. Dovnar-Zapolsky), the development of Belarusian art (M. M. Shchekotikhin), philosophical freedom of thought (V. D. Druzhchits) and others. Among the first thorough works, the book by E. F. Karsky «Belarusians» (1921) and articles of the collection «The Four Hundredth Anniversary of the Belarusian Press» (1926) are considered, which clearly reflect the theoretical achievements of scientists regarding the systematic solution of a number of issues related to the history of the Belarusian people, its language and culture. The article reveals the richness and diversity of the subject, as well as the fruitfulness of the ideas of the first Belarusian researchers.

**Keywords:** Belarusian people, spiritual life, history, Belarusian culture, science, scientific thought, first research, Belarusian statehood, language, art, scientific acquisitions.

Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. выклікала на тэрыторыі Беларусі магутны ўздым нацыянальнай самасвядомасці і глыбокі інтарэс да гісторыі і духоўнай культуры беларусаў. У гэтым напрамку ўжо ў 1920-я гг. у рэспубліцы разгарнулася даволі значная і дастаткова плённая праца. Былі створаны першыя навуковыя цэнтры, у якіх пачалася распрацоўка тэарэтычных праблем беларускай культуры, а таксама падрыхтоўка прафесійных навуковых кадраў. Такімі цэнтрамі сталі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (адкрыты ў 1921 г.) і Інстытут беларускай культуры (1922), на аснове якога ў 1928 г. узнікла Беларуская акадэмія навук. У гэтых навуковых установах першапачаткова была сканцэнтравана большасць нацыянальных навуковых кадраў, якія засяродзілі ўвагу на распрацоўцы метадалагічных падыходаў да раскрыцця тэндэнцый і заканамернасцей духоўнага жыцця беларускага народа (Я. Ф. Карскі), беларускай дзяржаўнасці (М. В. Доўнар-Запольскі), развіцця беларускага мастацтва (М. М. Шчакаціхін), філасофскага вальнадумства (В. Д. Друшчыц, М. А. Янчук), асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны (У. І. Пічэта, М. М. Піятуховіч), філасофскіх поглядаў С. Буднага (М. А. Янчук) і інш.

Сапраўднай энцыклапедыяй беларусазнаўства стала фундаментальнае даследаванне Я. Ф. Карскага «Беларусы» [2]. У ім упершыню быў сабраны і сістэматызаваны багаты і разнастайны матэрыял па актуальных пытаннях беларускай культуры. Гэту кнігу акадэмік В. М. Ляпуноў ахарактарызаваў як працу, «роўную якой па абгрунтаванасці цяжка знайсці ў вобласці вывучэння славянскіх народаў» [3, с. 25]. Я. Ф. Карскі ўпершыню прывёў каштоўныя звесткі пра Беларусь і яе насельніцтва, даў разгорнуты нарыс яе гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, дыялекталогіі беларускага народа, акрэсліў межы распаўсюджвання беларускай мовы, закрануў пытанні паходжання беларускага этнасу і яго мовы, склаў падрабязную бібліяграфію, пералічыўшы ў храналагічнай паслядоўнасці ўсе працы, прысвечаныя беларускай мове, гісторыі і этнаграфіі, зрабіў

агляд асноўных помнікаў беларускага пісьменства, а таксама іх выданняў. Значнасць навуковых пошукаў даследчыка цяжка перабольшыць. Па сутнасці гэта была першая ўдалая спроба сістэмнага вырашэння пытанняў, звязаных з гісторыяй беларускага народа, яго мовы і культуры.

Асобнае месца сярод першых даследаванняў беларускіх навукоўцаў належыць выдадзенаму ў 1926 г. юбілейнаму зборніку «Чатырохсотлецце беларускага друку» [5], які паклаў пачатак комплекснаму вывучэнню гісторыі беларускай культуры і дзейнасці найбольш выбітных яе прадстаўнікоў. У падрыхтоўцы выдання прынялі ўдзел У. І. Пічэта, У. Н. Перцаў, М. М. Шчакаціхін, Д. Ф. Жылуновіч, М. М. Піятуховіч і інш. У іх артыкулах змястоўна было разгледжана развіццё Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў XVI ст., прааналізаваны светапогляд выдатных прадстаўнікоў беларускай культуры таго часу. Асаблівая ўвага была засяроджана на асобе Францішака Скарыны, дзейнасць якога характарызавалася даследчыкамі як сапраўдная эпоха ў развіцці беларускай культуры. А. М. Ясінскі даследаваў культурнае развіццё Чэхіі ў пачатку XVI ст.; Д. М. Ягораў прывёў падрабязныя звесткі аб становішчы Падуанскага ўніверсітэта ў XV–XVI стст., дзе Ф. Скарына атрымаў навуковую ступень доктара лекарскіх навук; І. В. Воўк-Левановіч прааналізаваў мову скарынінскіх выданняў Бібліі [5]. У. І. Пічэта ў артыкуле «Scoriniana» назваў эпоху, звязаную з творчасцю славутага гуманіста, «Беларускім Адраджэннем», упершыню ўвёўшы дадзенае паняцце ў навуковы зварот. Адметнай рысай той эпохі, на погляд даследчыка, быў «гуманістычны рух, нацыянальны ў сваёй аснове і індывідуалістычны па свайму характару» [5, с. 317].

Гісторык мастацтва М. М. Шчакаціхін не толькі характарызаваў гравюры і аздобы скарынінскай Бібліі, але імкнуўся ўбачыць іх сувязь з аналагічнымі ўзорамі з Заходняй Еўропы. Ён таксама спрабаваў больш дакладна высветліць гады выдання кніг Ф. Скарыны, аналізуючы не толькі гравюры, але і паперу [6, с. 437]. Пазней М. М. Шчакаціхін прапанаваў смелую гіпотэзу аб дакладнай даце нараджэння самога Ф. Скарыны, звярнуўшы ўвагу на яго асабісты герб з выявай Сонца, паўзаслоненага Месяцам. Вучоны прыйшоў да высновы, што Ф. Скарына павінен быў нарадзіцца менавіта ў час сонечнага зацьмення, бачнага яго бацькам у Полацку [7]. Згодна астранамічным дадзеным, яно адбылося 6 сакавіка 1486 г.

Значнае месца ў працах беларускіх вучоных адводзілася Сымону Буднаму. Даследчыкі ўдакладнялі біяграфічныя звесткі, рабілі першыя спробы аналізу яго творчасці. М. А. Янчук разглядаў дзейнасць С. Буднага ў Клецку і Нясвіжы, вынікам якой стала адкрыццё нясвіжскай тыпаграфіі, а таксама выданне ў 1562 г. лютэранскага «Катэхізіса» і твора «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Вучоны адзначыў, што ў ім «Будны не абмяжоўваўся рэлігійна-дагматычным пытаннем, але закранаў пытанні палітычныя і сацыяльныя» [8, с. 27]. У. І. Пічэта аргументавана

даказаў, што «Свабодная і незалежная думка Буднага праявілася ва ўсім бляску ў крытыцы біблейскіх тэкстаў, дзе Будны паказаў сябе вельмі добрым каментатарам і выдатным крытыкам, які не спыняўся на паўшляху і не баяўся ніякіх высноў» [5, с. 143].

У даследаваннях гісторыі феадальнага права Беларуска-Літоўскай дзяржавы актыўны ўдзел прымалі маладыя навукоўцы: Т. Забела прааналізавала адносіны землеўласнікаў і земляробаў на аснове Статута 1588 г. [1]; К. Таўсталес займалася вывучэннем грамадзянскага і сямейнага права [4].

Такім чынам, у 1920-я гг. актыўнымі намаганнямі першай хвалі беларускіх навукоўцаў былі дасягнуты значныя вынікі ў даследаванні гісторыі беларускай культуры. Дзякуючы ім беларуская навука ўзбагацілася каштоўнымі працамі, якія вярнулі з нябыту важныя гістарычныя факты, грамадска-палітычныя падзеі, арыгінальныя філасофскія ідэі. Усё гэта стала трывалым падмуркам для навуковых пошукаў наступных пакаленняў даследчыкаў, у т. л. і сучасных.

1. *Забела, Т. І.* Землеўласнік і земляроб па Статуту Літоўскаму 1588 г. // Працы БДУ. – Мінск, 1928. – № 21. – С. 122–128.

2. *Карский, Е. Ф.* Белорусы : в 7 т. / Е. Ф. Карский. – Петроград : 12-я Гос. Тип., 1903–1922. – Т. 3 : Очерки словесности белорусского племени. – Ч. 2 : Старая западнорусская литература. – 1921. – 246 с.

3. *Ляпунов, В. М.* Очерки жизни и деятельности академика Е. Ф. Карского / В. М. Ляпунов // Изв. АН СССР по Отд-нию обществ. наук. – М., 1932. – № 3. – С. 167–179.

4. *Таўсталес, К.* Застаўнае права / К. Таўсталес // Працы БДУ. – Мінск, 1928. – № 21. – С. 122–128.

5. Чатырохсотлецце беларускага друку = Quadringentennium tuporum alboruthecorum : 1525–1925 : зборнік / Ін-т беларус. культуры ; [склад.: У. Перцаў і інш. ; рэд. каміс.: У. Пічэта і інш.]. – Мінск : Інбелкульт, 1926. – [3], 353, [5] с., [65] л. іл.

6. *Шчакаціхін, М.* Да пытання аб храналогіі «Малой падарожнай кніжыцы» Скарыны / М. Шчакаціхін // Запіскі аддзела гуманітарных навук Інбелкульта. Працы класа гісторыі. – Мінск, 1923. – Кн. 3. – Т. 2. – С. 435–450.

7. *Шчакаціхін, М.* Калі радзіўся Францішак Скарына / М. Шчакаціхін // Полымя. – 1925. – № 5. – С. 148–151.

8. *Янчук, М. А.* Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры / М. А. Янчук. – Мінск : Адраджэнне, 1922. – 118 с.